***Н.С. Каспяровіч***
Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь (Мінск)

# ПАЛІТЫКА-ПРАВАВЫЯ ПОГЛЯДЫ У.І. ЛЕНІНА НА ЗАКОННАСЦЬ У САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЕ

*«Найменшае беззаконне, найменшае парушэнне*
*савецкага парадку ёсць ужо дзірка, якую неадкладна*
*выкарыстоўваюць ворагі працоўных ...»*
*У.І. Ленін*

Як паказвае сусветны і айчынны вопыт у тэорыі права ёсць тэмы, якія заўсёды будуць карыстацца павышаннай увагай і выклікаць самы жывы інтарэс. На працягу развіцця юрыспрудэнцыі актуальным пытаннем даследавання шматлікіх навукоўцаў з'яўлялася праблема законнасці. Разглядаючы законнасць у рэтраспектыўным плане, варта сказаць, што гэтаму пытанню ў навуковай літаратуры савецкага перыяду надавалася значная ўвага.

У гэтым плане цікавай з’яўляецца пазіцыя У. І. Леніна, які разглядаў сацыялістычнае права і законнасць у непарыўным адзінстве з задачамі практычнай дзейнасці савецкага дзяржаўнага апарата, як дзейсны сродак аховы праў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян. Выкарыстоўваючы ўказанні У. І. Леніна, партыя нястомна вяла барацьбу за правільнае правядзенне ў жыццё прынцыпу дэмакратычнага цэнтралізму, скасоўвала залішнюю цэнтралізацыю, павышала адказнасць мясцовых органаў кіравання, развівала ініцыятыву народа.

Сучаснымі даследаваннямі даказана, што асаблівасцю ідэалогіі «рэвалюцыйнай законнасці», па меншай меры было тое, што гэта была законнасць без законаў, паколькі прынятых заканадаўчых актаў не існавала ў прынцыпе. Іх замяняла так званая "рэвалюцыйная правасвядомасць», а менавіта сукупнасць палітычных прынцыпаў і ідэй аб правамернасці і карыснасці тых ці іншых з'яў для будаўніцтва і ўмацавання новага сацыялістычнага ладу.

Цалкам відавочна, што прынцып сацыялістычнай законнасці з'яўляўся асноватворным для арганізацыі і ўсёй дзейнасці савецкіх органаў дзяржаўнага

кіравання. Гэта з асаблівай сілай падкрэслена ў Праграме КПСС: «Правасуддзе ў СССР ажыццяўляецца ў поўнай адпаведнасці з законам».

Важна таксама ўлічваць, што У. І. Ленін разглядаў рэвалюцыйную законнасць як адзін з найважнейшых сродкаў рашэння задач сацыялістычнага будаўніцтва, гаспадарчага і культурнага развіцця краіны. Разам з тым вынікі даследавання паказалі, што сацыялістычная законнасць выхоўвае ва ўсіх працоўных такія якасці, як сумленнасць і праўдзівасць перад партыяй, дзяржавай і народам, высокую патрабавальнасць да сябе і падначаленых, пільнасць і палітычную празорлівасць, узорнае выкананне ўстаноўленых норм і парадку працы ў савецкіх установах .

У 1922 г. у сваім лісце «Аб “падвойным” падначаленні і законнасці» І. В. Сталіну, У. І. Ленін выклаў палажэнні аб законнасці як пра асноватворны прынцып і паказаў метады яе забеспячэння. «Законнасць - пісаў Ленін, не можа быць калужская і казанская, а павінна быць адзіная ўсерасійская і нават адзіная для ўсёй федэрацыі Савецкіх рэспублікі.

Гэта сведчыць аб тым, што парушэнне сацыялістычнай законнасці вядзе да паслаблення Савецкай дзяржавы. Таму не выпадкова ворагі Савецкай дзяржавы ў якасці аднаго з метадаў сваёй падрыўной дзейнасці абіралі парушэнне сацыялістычнай законнасці.

Выкладзенае, на нашу думку, пераканаўча сведчыць пра тое, што асноўныя палажэнні, вылучаныя і распрацаваныя У. І. Леніным адносна законнасці, не толькі не страцілі свайго значэння, але, наадварот, ва ўмовах станаўлення і развіцця сучаснага права атрымалі новыя, больш шырокія магчымасці свайго ажыццяўлення.